**УДК 353.2.075:351.761(476.5-21)(091)“18/19”**

# СТРУКТУРА, АСАБОВЫ СКЛАД І АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНСКАГА КАМІТЭТА ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ (1897–1914 гг.)

***С.В. МЯНЬЧЭНЯ***
**Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск**

*Разглядаецца арганізацыя кіравання і ўдзел розных сацыяльных груп у працы Віцебскага губернскага камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці і яго праца па барацьбе з народным п’янствам. Адзначаецца, што некаторыя накірункі дзейнасці былі прадстаўлены слаба. На эфектыўнасць працы паўплывалі такія фактары, як недахоп фінансавання, бюракратызацыя дзейнасці камітэтаў, ігнараванне моўнай сітуацыі, што змяншала аўдыторыі мерапрыемстваў камітэтаў, неразвітасць грамадскіх органаў, беднасць і неадукаванасць насельніцтва.*

У 1894 годзе ў Расійскай імперыі па ініцыятыве міністра фінансаў С.Ю. Вітэ была пачата рэформа па ўвядзенні дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць і продаж моцных спіртных напояў. Мэтай рэформы было ўпарадкаванне продажу алкагольнай прадукцыі і спажывання гарэлкі насельніцтвам. Для нагляду за правядзеннем рэформы, а таксама для арганізацыі антыалкагольнай прапаганды на месцах ствараліся губернскія папячыцельства аб народнай цвярозасці. Мерапрыемствы пачаліся ў чатырох усходніх губернях (Пермскай, Уфімскай, Арэнбургскай і Самарскай), калі з’явіліся першыя станоўчыя вынікі, было прынята рашэнне аб далейшым распаўсюджванні манаполіі. З 1 ліпеня 1897 года вінная манаполія была зацверджана ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губернях [1, с. 14].

Структура і склад камітэтаў вызначаліся статутам. У склад папячыцельства ўваходзілі ганаровыя члены, участковыя-папячыцелі і члены-спаборнікі. Старшынёй быў губернатар, а ў склад кіраўніцтва ўваходзілі епархіяльны архірэй і дэпутат ад духоўнага ведамства, губернскі прадвадзіцель дваранства, старшыня і пракурор акруговага суда, віцэ-губернатар, упраўляючы казённай палатай, дзяржаўнай маёмасцю, кантрольнай палатай, акцызнымі зборамі і ўдзельнай акругай, дырэктар народных вучылішч, старшыня аддзялення сялянскага пазямельнага банка, начальнік губернскага жандарскага ўпраўлення, павятовы воінскі начальнік, медыцынскі інспектар, старшыня губернскай земскай управы і гарадскі галава Віцебска [2, арк. 3].

Павятовымі камітэтамі кіравалі прадвадзіцелі дваранства, у лік абавязковых членаў уваходзілі: дэпутат ад духоўнага ведамства (па прызначэнні мясцовага епархіяльнага начальства); начальнікі сярэдніх навучальных устаноў, настаўніцкіх семінарый; інспектары народных вучылішч; павятовы член і таварыш пракурора акруговага суда; павятовы спраўнік; паліцмайстар; акцызны чыноўнік; павятовы воінскі начальнік; памочнік начальніка губернскага жандарскага ўпраўлення; участковыя земскія начальнікі; падатныя інспектары; абавязковы член па сялянскіх справах прысутнасці; павятовы або гарадавы лекар; ганаровыя і ўчастковыя сусветныя суддзі; гарадскі галава павятовага горада [3, с. 46]. Гэта давала камітэтам значныя магчымасці, але з іншага боку пераўтварала іх у бюракратычныя арганізацыі, члены якіх часцей за ўсё былі занятыя на асноўным месцы службы. Нягледзячы на значную колькасць абавязковых членаў, пратаколы пасяджэнняў камітэтаў паказваюць, што рэальны ўдзел у рабоце прымалі 7–8 чалавек. У гарадах мелася магчымасць стварэння асобных гарадскіх камітэтаў, пры гэтым іх склад вызначаўся Міністэрствам фінансаў у кожным асобным выпадку, але ў Віцебскай губерні дадзеная практыка не атрымала распаўсюджвання.

Ганаровыя члены камітэта абіраліся з ліку асоб, якія аказалі асаблівыя паслугі камітэту, што часта выяўлялася ў аказанні значнай фінансавай падтрымкі, зацвярджаліся асабіста міністрам фінансаў і мелі права голасу на павятовым або губернскім сходзе. Члены-спаборнікі абіраліся з асоб, якія выказалі жаданне прыняць удзел у працы, і зацвярджаліся губернскімі камітэтамі. Яны мелі права прымаць удзел у працы павятовых камітэтаў з правам дарадчага голасу [3, с. 47].

Не маглі з'яўляцца членамі папячыцельства наступныя катэгорыі грамадзян: непаўналетнія (акрамя тых, што мелі класныя і афіцэрскія чыны); ніжэйшыя воінскія чыны на сапраўднай службе; выхаванцы навучальных устаноў; асобы, якія займаліся гандлем моцнымі спіртнымі напоямі; асобы, якія знаходзіліся пад следствам або судом па датычнасці да злачынства, за якое прадугледжвалася пакаранне не ніжэй за турэмнае зняволенне; асобы, якія знаходзіліся пад апекай за марнатраўнасць, і прызнаныя банкрутамі; якія знаходзіліся пад наглядам паліцыі; выключаныя з духоўнага ведамства або з серады грамадскіх і дваранскіх сходаў.

З ліку абавязковых, ганаровых і членаў-спаборнікаў мужчынскага полу абіраліся ўчастковыя папячыцелі, у чые абавязкі ўваходзіла выкананне даручэнняў камітэтаў на месцах, загадванне ўстановамі

камітэтаў (народныя дамы, чайныя, чытальні і бібліятэкі), нагляд за нелегальным продажам моцнага алкаголю з правам складання пратаколаў у выпадку выяўлення парушэнняў. Для абазначэння прыналежнасці да камітэту і "ўзняцця аўтарытэту" члены забяспечваліся адмысловымі знакамі, а таксама дыпломамі і пасведчаннямі з выпіскамі з статута папячыцельства. Ганаровыя члены атрымлівалі права нашэння мундзіра Міністэрства Фінансаў VI класа [3, с. 49].

Члены-спаборнікі з 1901 года сваю прыналежнасць да папячыцельства павінны былі пацвердзіць альбо актыўнай працай, альбо штогадовым унёскам у 5 рублёў. Дадзены факт значна паўплываў на іх колькасць і сацыяльны склад. Так, калі ў пачатку 1901 года толькі ў складзе Рэжыцкага папячыцельства налічвалася 159 членаў-спаборнікаў, то ў 1905 годзе на ўсю губерню – усяго 340 [4, арк. 14–19; 5, арк. 299–300]. У далейшым гэта колькасць працягвала змяншацца і ў 1907 годзе склала 296 чалавек [6, арк. 232–233]. Карэнным чынам адрозніваліся актыўнасць грамадзян у асобных павятовых камітэтах. У 1906 годзе найбольш вялікія па колькасці спаборнікаў камітэты дзейнічалі ў Дзвінскім (65 чалавек), Люцынскім (47), Невельскім (41) і Веліжскім (40) паветах. Аднак далей вызначалася, што ў Дзвінскім папячыцельстве актыўны ўдзел у працы прымае ўсяго 28 чалавек, у Люцынскім – 2, у Полацкім (12) і Рэжыцкім (26) – ніводнага. Самы малаколькасны Дрыссенскі камітэт (3) адзначаў, што ўсе яго спаборнікі вядуць актыўную працу [7, арк. 8–9адв.].

У 1897 годзе, пры заснаванні папячыцельства, планавалася зрабіць стаўку на дваранства. Люцынскі камітэт паведамляў, што "запрашэнні ўзяць удзел у працы камітэтаў атрымалі землеўладальнікі, але адгукнуліся нямногія". Дваранства паставілася да дзейнасці папячыцельства як да формы дабрачыннасці і на першых парах дапамагала папячыцельствам у фінансавым плане. Пасля няўдачы з дваранамі запрашэнні ўзяць удзел у працы атрымалі настаўнікі і мясцовыя чыноўнікі [8, арк. 7]. Асаблівая роля адводзілася духавенству, якое называлася "самым надёжным элементом, при помощи которого можно осуществлять свои планы" [6, арк. 151]. Святары, карыстаючыся сваім аўтарытэтам, павінны былі весці тлумачальную працу з насельніцтвам. Дадзеныя катэгорыі і склалі аснову папячыцельства. Па сацыяльнаму складу ў Віцебскім папячыцельстве ў 1906 годзе сярод членаў-спаборнікаў пераважала духавенства (20%), чыноўнікі і афіцэры (18,5%), настаўнікі (14,4%) і землеўладальнікі (12,6%) [7, арк. 8–9адв.]. Сярод участковых папячыцеляў, па дадзеных 1907 года, пераважалі, землеўладальнікі (22%), а таксама чыноўнікі (20%), духавенства (16%) і настаўнікі (10%) [6, арк. 232–233]. Найменш прадстаўленай катэгорыяй насельніцтва былі сяляне. На гэта паўплывалі ўвядзенне гадавога ўзноса, бюракратызацыя працэса прызначэння. Так, у 1906 годзе сялянамі з'яўляліся 4 члена-спаборніка ў Дзвінскім і 9 у Невельскім камітэтах. Сярод участковых папячыцеляў сяляне былі толькі ў Дзвінскім павятовым папячыцельстве [7, арк. 8–9адв.].

Фінансаванне папячыцельства арганізоўвалася з розных крыніц. Асноўныя грашовыя сродкі паступалі з казны ў Віцебск, а адтуль размяркоўваліся па павятовым камітэтам (11 паветаў). Першапачатковая сума складала ад 30 000 да 40 000 рублёў на губерню, але падзеі Руска-японскай вайны і рэвалюцыі 1905–1907 гадоў прывялі да скарачэння фінансавання папячыцельстваў амаль у два разы. У 1908 годзе павятовыя камітэты атрымлівалі ад 2000 (Віцебскі) да 750 рублёў (Дзвінскі) [9, арк. 100]. Зарабляць сродкі папячыцельства павінны былі за кошт правядзення мерапрыемстваў і ад даходаў сваіх устаноў, а менавіта даходаў ад чайных, продажу кніг, народных чытанняў і гулянняў. Аднак выйсці на самаакупнасць так і не ўдалося. У 1909 годзе Віцебскі павятовы камітэт атрымаў прыбытку 2900, тады як выдаткі склалі 5050 рублёў [9, арк. 3]. Членскія ўзносы і прыватныя ахвяраванні складалі толькі малую долю сродкаў. Члены-спаборнікі аддавалі перавагу альбо "актыўнай дзейнасці", якая часцей за ўсё выяўлялася ў нічым не пацверджаных гутарках з абывацелямі, альбо пакідалі папячыцельства. У 1907 годзе членскі ўзнос заплаціў толькі адзін член-спаборнік (Полацкі камітэт) [6, арк. 234адв.]. Прыватныя ахвяраванні таксама былі рэдкімі выпадкамі і часцей за ўсё ўяўлялі сабой нязначныя сумы. Таксама папячыцельства павінна было атрымліваць даход у выглядзе штрафаў за парушэнне піцейнай манаполіі, калі такія выпадкі выяўляліся членамі-папячыцелямі. Аднак гэты бок дзейнасці папячыцельства быў найбольш праблемны і даходу не прыносіў. Члены папячыцельства не жадалі выконваць паліцэйскія функцыі, каб не паставіць пад удар свае адносіны з суседзямі, часам гэта дзейнасць несла небяспеку для жыцця. Такім чынам, выйсці на самафінансаванне Віцебскае губернскае папячыцельства так і не здолела, і заставалася залежным ад дзяржаўных датацый.

Дзейнасць папячыцельстваў была накіравана на антыалкагольную прапаганду і народную асвету. Паняцце «цвярозасць» разумелася як прапаганда памяркоўнага, «культурнага» спажывання спіртных напояў, а не поўнае ўстрыманне ад алкаголю [2, арк. 3], што не зусім адпавядала як агульнапрынятаму сэнсу, так і чаканням грамадскасці. Кіраўнік Люцынскага павятовага камітэта папячыцельтва аб народнай цвярозасці Віцебскай губерні князь Мікалай Мяшчэрскі ўвогуле адзначаў, што "главное зло заключается не столько в злоупотреблении спиртными напитками со стороны населения, сколько от питейных заведений принятого типа с его евреем-сидельцев или смотрителем, цель которого заключается в спаивании посетителя до самозабвения" [8, арк. 2]. На практыцы дзейнасць папячыцельстваў выяўлялася ў арганізацыі чайных, народных дамоў, чытальняў і кніжных складоў, народных чытанняў, вячэрніх школ, тэатральных прадстаўленняў і народных гулянняў.

Цэнтрамі антыалкагольнай дзейнасці на месцах з'яўляліся чайныя. Пры арганізацыі чайных быў рэалізаваны вопыт заходнееўрапейскіх кавярняў, якія паспяхова дзейнічалі ў Вялікабрытаніі, Германіі і Швецыі. Ужо восенню 1898 года ў Віцебскім павеце было 7 народных чайных, а па губерні іх колькасць дасягнула 50 [10, с. 216]. Але ў справаздачы губернскага камітэта за 1906 год адзначалася: "народные чайные и столовые в Витебской губернии функционируют вообще слабо". Нерэнтабельнасць, высокая арэндная плата і адсутнасць інтарэсу з боку насельніцтва прымусіла Лепельскі камітэт з 1904 года закрыць усе чайныя і засяродзіцца на іншых баках дзейнасці [7, арк. 6]. У 1907 годзе ліквідаваў усе свае ўстановы Люцынскі камітэт, а на наступны год колькасць чайных па губерні скарацілася да 15. Па 3 чайных прыходзілася на Гарадокскі і Веліжскі павет, па 2 – у Віцебскім і Себежскім, па 1 – у Дзвінскім, Дрысенскім, Невельскім, Полацкім і Рэжыцкім паветах [11, арк. 265–266]. Асноўнай дзейнасцю чайных быў продаж гарбаты. Порцыя гарбаты каштавала 4 капейкі, але пры гэтым адрознівалася яе якасць: у Дзвінскім павеце на 1 фунт гарбаты прыходзілася 96 порцый, у Полацкім – 192, Віцебскім – 200 [12, арк. 10]. Да гарбаты падаваліся халодныя закускі ў выглядзе абаранкаў, сушак і селядца. Гарачае харчаванне ў 1905 годзе было арганізавана толькі ў 4 чайных з 50 [5, арк. 306-307], а ў 1908 годзе ўвогуле адсутнічала. Акрамя гэтага, чайныя ажыццяўлялі продаж чаю і цукру на вынас, тытуню, пісьмовых прылад і паштовых марак.

Не дасягнула поспехаў Віцебскае губернскае папячыцельства і ў сферы арганізацыі тэатральных гурткоў і спектакляў. Тэатральныя трупы былі створаны ў Полацку і Лепелі [13, арк. 51–52]. Аднак грамадская ініцыятыва сутыкнулася з неадназначнай пазіцыяй улады. У 1900 годзе з'яўляецца цыркуляр Міністэрства Фінансаў № 503 "По вопросу устройства попечительствами о народной трезвости театральных для народа развлечений" за подпісам С. Вітэ, які сведчыць: "театральные представления будут привлекать к себе народные массы, но именно в этом и кроется известная опасность, в том смысле, что народ, приученный к посещению театральных зрелищ, теряет, так сказать, вкус к иным более однообразным способам препровождения времени". У сувязі з чым рэкамендавалася арганізоўваць спектаклі пераважна ў гарадах, буйных завадскіх і гандлёвых паселішчах, па-за горадам спектаклі павінны былі "сохранять характер случайных явлений". Адказна трэба было паставіцца і да выбару рэпертуару, пры гэтым "не потакать низким вкусам, преобладающей части городского населения из интеллигентной и полуинтеллигентной среды", а "отвечать потребностям низшего класса" [13, арк. 41–42]. Цяжка адказаць, ці адпавядалі гэтым патрабаванням спектаклі Полацкага камітэта ў 1899 годзе: "Тёща в дом, всё вверх дном", "Трагик по неволе", "Иван Иванович виноват" [13, арк. 52]. Прапанова Віцебскага павятовага камітэта пабудаваць на Юр'евай горцы летні тэатр выклікала інспекцыю Галоўнага ўпраўлення неакладных збораў і казённага продажу піцей, якая забараніла будаўніцтва, спасылаючыся на тое, што "в черте еврейской оседлости городское население преимущественно состоит из евреев, не злоупотребляющих в большинстве своём крепкими напитками" [13, арк. 119адв.]. Так званыя "народныя спектаклі" для "простага люду" праходзілі ў Віцебскім гарадскім тэатры, але ў 1903 годзе высветлілася, што наведваюцца яны толькі гарадской публікай (чыноўнікамі і яўрэямі), простага народу ў тэатры не заўважалась. У сувязі з чым спектаклі былі адменены [14, арк. 5].

Не атрымала распаўсюджвання, у адрозненні ад Мінскай губерні, і практыка арганізацыі народных хароў, што тлумачылася вялізнымі выдаткамі. Толькі ўтрыманне гарадскога хора з 30 чалавек каштавала Віцебскаму павятоваму камітэту 1500 рублёў у год, што у лепшыя часы складала палову датацыі казны. У верасні 1903 года хор быў распушчаны [14, арк. 6]. У 1907 годзе ў губерні засталося ўсяго 2 хора – у Дзвінскім і Рэжыцкім паветах [6, арк. 244адв.–245].

Крыху лепш абстаяла справа з арганізацыяй народных чытанняў. Выключэнне складалі Дзвінскі, Рэжыцкі і Люцынскі камітэты, члены якіх неаднаразова звярталі ўвагу на тое, мясцовае латышскае насельніцтва не разумее рускай мовы, на якой праводзіліся чытанні, і ў большасці сваёй не можа чытаць на рускай мове. Але ўсе просьбы аб дазволе арганізаваць чытанні на латышскай мове ці выпісаць латышскія газеты і часопісы не былі прыняты губернскім камітэтам [15, арк. 47]. У 1907 годзе Віцебскае губернскае папячыцельства арганізавала 785 народных чытанняў [6, арк. 242адв.–243]. Гэты паказчык быў сярэдні па краіне, першае месца займала Мінская губерня – 5194 чытанняў [15, арк. 405]. Лідарамі па Віцебскай губерні з'яўляліся Гарадокскі камітэт (300 чытанняў), Полацкі (217) і Лепельскі (176), на долю якіх выпадала 88% чытанняў. Са 114 лектараў 85 з'яўляліся настаўнікамі, 25 – святарамі, 4 былі адзначаны як "прочие" [6, арк. 242адв.–243]. Тэматыка чытанняў была дастаткова разнастайнай, але ў той жа час, залежыла ад кампетэнцыі лектара. У якасці рэкамендаванага для чытанняў выкарыстоўвалася выданне "Духовно-нравственные беседы" настаяцеля Полацкага гарадскога сабора Стэфана Забеліна [17, арк. 60]. У сельскай мясцовасці папулярнымі былі чытанні на гаспадарчую тэматыку: аб травасеянні, ужыванні ўгнаенняў, аб тлумачэннях мерапрыемстваў аграрнай рэформы П. Сталыпіна і г.д. У той жа час у губерні дзейнічала 96 бібліятэк і чытальняў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, якія дазвалялі ці чытаць кнігі на месцы, ці браць на абанемент. З іх 36 у Гарадокскім павеце, 21 – у Невельскім, 16 – у Полацкім. Але пры гэтым у Гарадокскім павеце налічвалася 5500 абанентаў і 1500 наведвальнікаў, тады

як 5 бібліятэк Лепельскага камітэта ахоплівалі 13 200 абанентаў [6, арк. 240адв.–241]. У 1910 годзе ў Лепельскім павеце дзейнічала ўжо 27 чытальняў, якія абслугоўвалі 25 493 абанента [18, арк. 5–6].

Найбольшых поспехаў Віцебскі губернскі камітэт папячыцельства аб народнай цвярозасці дасягнуў у справе арганізацыі вячэрніх школ. Тры з іх былі арганізаваны ў Дзвінске і па адной ў Дрысе, Лепелі і Полацку. Вучні як дарослыя, так і дзеці вывучалі Закон Божы, пісьмо, лік, чытанне. Дзвінскія школы для дарослых забяспечвалі вучняў кнігамі, сшыткамі, алоўкамі і чарнiламі [16, арк. 625]. Дрысенская школа была разлічана для дзяўчат, налічвала ў 1910 годзе 69 вучаніц, якія падзяліліся на 5 груп па ўзроўню ведаў [18, арк. 99а]. У Лепелі курсы для дарослых былі арганізаваны пры гарадскім вучылішчы [16, арк. 614], а ў Полацку непасрэдна ў гарадской чайной [9, арк. 74]. У Полацку вучняў навучалі яшчэ і пенію. Адрозніваліся школа і канфесійным складам навучэнцаў. Так, у 1 семестры 1905 года тут было 50 вучняў, з якіх 27 (54%) былі праваслаўнымі, 2 (4%) стараабрадцамі, 6 (12%) католікамі, 15 (30%) іўдзеямі. У 2 семестры колькасць вучняў вырасла да 98, пры гэтым удзельная вага праваслаўных і іўдзеяў знізілася 43 (44%) і 24 (24,2%) вучня адпаведна, а працэнт каталікоў і стараабрадцаў узрос – 17 (17,3%) і 14 (14,4%) [5, арк. 190–191]. Але ў 1907 годзе школа ў Полацку, пасля 3 год працы, была зачынена, у сувязі з недахопам фінансавання [9, арк. 74].

Яшчэ адным накірункам дзейнасці стала арганізацыя народных гулянняў як рэгулярных, так і прысвечаных памятным падзеям. Віцебскі павятовы камітэт арэндаваў для гулянняў Юр’еву горку, дзе знаходзілася часовая чайная, каруселі, летняя сцэна, дзе граў аркестр і праходзілі кінасеансы. Тут жа праходзілі веласіпедныя спаборніцтвы [19, арк. 3]. Дадзеная пляцоўка дзейнічала да 1908 года, пакуль не скончыўся перыяд арэнды, працягнуць якую камітэт не здолеў з-за фінансавых цяжкасцей [11, арк. 272]. Зімой 1902 на Дзвіне быў арганізаваны каток “для отвлечения народа от пьянства и кулачных боёв” [19, арк. 3]. Урачыста святкаваліся юбілеі А. Пушкіна (1899), М. Гогаля (1901), якія суправаджаліся народнымі чытаннямі і распаўсюджваннем танных выданняў твораў і партрэтаў пісьменнікаў. Гулянні адбываліся ў гонар 50-годдзя адмены прыгоннага права (1911), Айчыннай вайны 1812 г., 300-гадавага юбілея дома Раманавых. Гарадокскі камітэт сабраў у 1911 годзе 400 руб. на ўсталяванне бюста Аляксандра ІІ [20, арк. 137]. Дрысенскі камітэт даглядаў мемарыял генарала Я. Кульнёва і 19 ліпеня 1912 года арганізаваў гулянні ў гонар бітвы пад Клясціцамі [18, арк. 55].

Да 1911 года папячыцельства аб народнай цвярозасці амаль вычарпалі свае рэсурсы. У Полацкім камітэце налічвалася 10 спаборнікаў, у Гарадокскім толькі 2 і ніводнага папячыцеля. Колькасць чайных у губерні скарацілася да 3 [20, арк. 87, 116–117, 121]. Паказальнікам эфектыўнасці папячыцельства з’явіўся збор экспанатаў для Міжнароднай выставы ў Турыне (1911). Для стэнда папячыцельстваў аб народнай цвярозасці Рэжыцкі камітэт прапанаваў фотаздымак народнага дома, Гарадокскі – план народнага дома, Полацкі – фотаздымак вячэрніх курсаў. Астатнія павятовыя камітэты паведамілі, што не могуць выслаць нічога [16, арк. 631–643]. Ва ўмовах Першай сусетнай вайны Віцебскае губернскае папячыцельства фактычна спыніла сваю дзейнасць.

Такім чынам, дзейнасць Віцебскага губернскага папячыцельства аб народнай цвярозасці з'яўлялася часткай дзяржаўнай праграмы па ўвядзенні віннай манаполіі і абмежаванні спажывання насельніцтвам моцных спіртных напояў. У аснове дзейнасці папячыцельства быў пакладзены прынцып узаемадзеяння дзяржаўных органаў, царквы і грамадскасці, які не даў чакаемых вынікаў з-за абмежаванасці мэтаў папячыцельстваў. Насельніцтва, за выключэннем настаўнікаў і святароў, не праявіла асаблівай актыўнасці ў працы. Дзейнасць папячыцельства выявілася ў распаўсюджванні чайных, антыалкагольнай прапагандзе, культурна-асветніцкай і дабрачыннай працы з насельніцтвам. Найбольшых вынікаў Віцебскае губернскае папячыцельства дасягнула ў справе арганізацыі вольнага часу насельніцтва, бібліятэк і школ. Астатнія накірункі дзейнасці – стварэнне чайных, народных хароў, правядзенне чытанняў і спекталей – былі прадстаўлены слаба. На эфектыўнасць працы паўплывалі такія фактары як недахоп фінансавання, бюракратызацыя дзейнасці камітэтаў, ігнараванне моўнай сітуацыі, што змяншала аўдыторыі мерапрыемстваў камітэтаў, неразвітасць грамадскіх органаў, беднасць і неадукаванасць насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА


1. Протько, Т.С. В борьбе за трезвость / под ред. М.О. Бича. – Минск : Наука и техника, 1988. – 162 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 2.
3. Соболевский, А.В. Основы трезвости (опыт руководства для школ) / А.В. Соболевский. – СПб., 1898. – 167 с.
4. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 53.
5. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 79.
6. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 85.
7. НГАБ. – Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 238.
8. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 4.
9. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 82.
10. Мяньчэня, С.В. Арганізацыя работы чайных на Беларусі ў 1897–1914 гг. (па матэрыялах Віцебскай і Магілёўскай губерняў) / С.В. Мяньчэня // Научные труды Республиканского института высшей школы:

Исторические и психолого-педагогические науки / под ред. д. ф. н., проф. В.Ф. Беркова : в 2 ч. – Минск : РИВШ, 2014. – Ч. 1. – 370 с.
11. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 83.
12. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 71.
13. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 54.
14. НГАБ. - Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 201.
15. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 13.
16. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 87.
17. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 15.
18. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 94.
19. НГАБ. – Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 200.
20. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 91.

## STRUCTURE, PERSONNEL AND THE MAIN ACTIVITIES OF VITEBSK PROVINCIAL COMMITTEES OF THE PEOPLE'S WELFARE SOBRIETY (1897-1914)

***S. MENCHENJA***

*The article is devoted to the organization's management and the participation of different social groups in the Vitebsk provincial committee of the people's sobriety and struggle against the people's drunkenness: organizing of tea-houses, popular lectures, theater performances, folk festivals. The work of committee was based on the principle of interaction of state institutes, churches and the public, which did not give the expected results due to the limited purposes. The population, with the exception of teachers and priests, did not show much activity in the work. The greatest results of Vitebsk provincial committee achieved in the organization of leisure of the population, libraries and schools. The rest of the activities - the creation of tea-houses, folk choirs, conducting of readings and performance - were represented weakly. Factors, that led to this situation, were lack of funding, the bureaucratization of the activities of committees, ignoring the linguistic situation, which reduced the audience committees activities, inadequate public institutes, poverty and lack of education of the population.*